

ЛЮБІ СЯБЕ, КАБ ПАЛЮБІЦЬ ЖЫЦЦЁ

Сямейная газета

ЦІ ЛЁГКА СКРАСЦІ КАРАЛІ АД CARTIER 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 122 (28738)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:**

*«Падчас свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), як заўсёды, чакаецца шмат розных культурных і забаўляльных мерапрыемстваў з удзелам айчынных і замежных музыкантаў, артыстаў і творчых калектываў. У ліку краін-удзельніц — Беларусь, Расія, Украіна, Эстонія, Літва, Латвія і Польшча. Прычым гэта будуць як артысты і народныя майстры, так і беларускія грамадска-культурныя аб'яднанні замежжа, што вельмі сімвалічна ў Год малой радзімы».*

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Мемарыял ва ўрочышчы Благаўшчына пад Мінскам, дзе падчас вайны знішчалі вязняў лагера смерці «Трасцянец», фактычна гатовы да адкрыцця. Наш фотакарэспандэнт учора ўдзень застаў, як даводзяцца да ладу самыя дробныя нюансы.**

***На здымку:*** **Эльвіра МАРОЗ — эканаміст Уздзенскага ПМК-69. Гэта арганізацыя прымала самы непасрэдны ўдзел ва ўзвядзенні мемарыяла.**

## КОРАТКА

- **Пытанні паставак беларускай малочнай прадукцыі абмяркуюць 2 ліпеня міністры аграрных ведамстваў Беларусі і Расіі.**
- У Беларусі прапануюць увесці сацыяльны падатковы вылік па падаходным падатку ў суме расходаў на медыцынскія паслугі.



- **Рыбалоўны фэст пройдзе 30 чэрвеня ў Смалявіцкім раёне.**
- Пытанні ўтрымання і выгулу жывёл у Мінску ў найбліжэйшы час будуць вынесены на абмеркаванне гарвыканкама.
- **Эксперты з Нацыянальнага цэнтра даных пра снег і лёд пры ўніверсітэце Каларада (ЗША) выявілі, што тэмпература ў невялікіх правалах на Усходне-Антарктычным плато можа апускацца да мінус 98 градусаў па Цэльсію.**

ISSN 1990 - 763X

■ Вынаходнікі

## «Мінскі код» Аксёнава і Касцюкоўскага

### Будучыня — за лайтфонамі?

**Тое, што вынайшлі два нашыя навукоўцы, здольна выклікаць рэвалюцыю ў глабальнай сістэме сувязі. Хоць гэта здаецца неверагодным пасля таго, як інтэрнэт і сотавы тэлефон сталі ці не такімі ж банальнымі рэчамі, як пыласос і зубная шчотка. Чаго ўжо яшчэ? Тым не менш існуючыя спосабы перадачы інфармацыі далёкія ад дасканаласці. Дастаткова сказаць, што да гэтага часу немагчымы нармальныя перамовы паміж людзьмі, якія знаходзяцца, напрыклад, у розных падводных апаратах або касмічных караблях. Не кажучы ўжо пра тое, што большасць традыцыйных тэлекамунікацыйных прылад, у тым ліку мабільнікі, шкодныя для здароўя. Спосаб сувязі, які прыдумалі Юрый АКСЁНАЎ і Аляксей КАСЦЮКОЎСКІ, можа паспяхова вырашыць гэтыя праблемы.**



— Прапанаваная намі ідэя заключаецца ў выкарыстанні ўласцівасцяў святла, — спрабуе як мага прасцей растлумачыць сутнасць справы Юрый Аксёнаў *(на фота)*. — Светлавыя хвалі, як і электрамагнітныя, таксама маюць здольнасць пераносіць розныя сігналы: чалавечую гаворку, музыку, відэакарцінку. На гэтым заснавана работа валаконна-аптычных ліній сувязі. Але паколькі яны ўяўляюць сабой праваднуую сетку, то шмат у чым абмежаваныя. Мы ж прапануем яшчэ і бесправаднуую аптычную сістэму. Прынцыпова іншую, якая, у адрозненне ад радыёхвалёвай, запатрабавала больш дасканалай элементнай базы. Нам удалося вынайсці ўнікальны метад мадуляцыі сігналу. Створаны новы спосаб кадзіравання інфармацыі. Мы назвалі яго «Мінскім кодам». Уявіце, што ў вас у руках не традыцыйны айфон, які працуе на радыёхвалях, а мабільнік, арыентаваны на светлавыя імпульсы. Такі апарат — лайтфон — таксама наша ноу-хау.

СТАР. 4

■ Разумныя грошы

## ПЯЦЬ «ЗЛАДЗЕЯЎ», ЯКІЯ ЗАБІРАЮЦЬ ВАШЫЯ КРОЎНЫЯ

**Калі мы задумваемся аб фінансах, то часцей за ўсё ацэньваем свой дабрабыт зыходзячы з магчымасці часта здзяйсняць буйныя пакупкі. Аднак з часам нават дробныя затраты ператвараюцца ў істотныя выдаткі. З дапамогай сертыфікаваных спецыялістаў па фінансавым планаванні мы падабралі пяць рэчаў, на якія ідзе неапраўдана шмат грошай.**

### Другая аднолькавая кофтачка

Я б гэтую манію купляць з зайздросным пастаянствам падобныя ці абсалютна аднолькавыя рэчы назваў бы «дублікацызмам». Людзі часта трацяць грошы на тое, што ўжо ёсць у доме. Гэта адбываецца з-за неарганізаванасці, прычым праблема датычыцца самых розных рэчаў: ад прадуктаў да адзення. Эксперты раяць перад паходам у краму правяраць змесціва шаф і халадзільніка. А часам праверыць не перашкодзіць і аператыўную памяць уласнага «кацялка». Напрыклад, мая жонка абавязкова раз на тры ці шэсць месяцаў купляе бляшанку (ці дзве) печані траскі. Проста захацелася або тавар на знiжцы быў.

Салата, дзе прысутнічаюць гэтыя кансервы, вельмі пажыўная. Дапускаю, што нават карысная і неабходная, але... У нашай сям'і гэтая салата робіцца выключна на Новы год і на 23 лютага (не ведаю, па якой прычыне). У астатні час есці гэты далікатэс ніхто (у тым ліку і жонка) не жадае. У выніку ў нас ужо тры бляшанкі са скончаным тэрмінам прыдатнасці.

Мае суседзі днямі выкідалі ёмістасці з пратэрмінавай бытавой хіміяй. У суседавай жонкі свае «прусакі» ў галаве. А ў вас няма засасаў чагосьці вельмі патрэбнага? Так, на чорны дзень?..

СТАР. 3